ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (1081) ● Чацвер, 27 лютага 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## 19 КРАСАВІКА — КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК

### ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА КАЛЕКТЫВАЎ ПЕРАДАВЫХ МАСКОЎСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

У радзе працоўных будняў усесаюзныя камуністычныя суботнікі па праву займаюць асаблівае месца: гэта дні ўсенароднага энтузіязму, найвышэйшай прадукцыйнасці працы. Мільёны савецкіх людзей працуюць у гэтыя дні добраахвотна і бясплатна на карысць любімай Радзімы, у імя светлых ідэалаў, напісаных на сцягах нашай ленінскай партыі. Святкуючы дзень нараджэння У. І. Леніна, працоўныя краіны па традыцыі падводзяць вынікі работы, вызначаюць задачы на будучыню. У 1975 годзе нам трэба будзе завяршыць выкананне задач дзевятай пяцігодкі, намечаных XXIV з'ездам КПСС, і савецкія людзі зробяць усё, каб дасягнуць гэтай мэты.

З патрыятычнай ініцыятывай — правесці 19 красавіка камуністычны суботнік, прысвечаны 105-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, — выступілі калектывы перадавых маскоўскіх прадпрыемстваў.

На радзіме «Вялікага пачыну» — у лакаматыўным дэпо Масква-Сартавальная — адбыўся мнагалюдны мітынг. Старшыня савета камсамольска-маладзёжнай калоны імя XXIII з'езда КПСС машыніст Д. В. Багданаў ад імя таварышаў заклікаў усіх працаўнікоў дэпо азнаменаваць суботнік ударнай высокапрадукцыйнай працай. У гэты дзень, сказаў ён, машыністы будуць працаваць на сэканомленых матэрыялах і электраэнергіі. Са станцыі Масква-Сартавальная у адну з брацкіх саюзных рэспублік будзе адпраўлен ленінскі эстафетны маршрут прамога прызначэння з прадукцыяй сталічных заводаў.

Выступаўшыя падтрымалі прапанову камсамольцаў і моладзі калоны. У дзень суботніка працаўнікі дэпо абавязаліся адрамантаваць сем лакаматываў — на два больш, чым звычайна, і адзін кран. Калектыў будзе працаваць бясплатна, на сэканомленых матэрыялах і электраэнергіі.

З транспарантамі, на якіх напісаны словы «Падтрымліваем традыцыі «Вялікага пачыну», «Мы прыйдзем да перамогі камуністычнай працы», «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — выканаем!», прыйшлі 20 лютага на мітынг работнікі лакаматыўнага дэпо імя Ільіча.

Удзельнікі мітынгаў звярнуліся да ўсіх працоўных Масквы з заклікам азнаменаваць 105-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна ударнай працай на камуністычным суботніку, паказаўшы ў гэты дзень найвышэйшую прадукцыйнасць працы, працаваць на сэканомленых энергарэсурсах, сыравіне і паліве.

(Кар. ТАСС).

## ПАМЯТАЦЬ УРОКІ СЕСІІ

Вынікі экзаменацыйнай сесіі, якая нядаўна закончылася, паказалі, што вучэбны план I семестра на ўсіх факультэтах і па ўсіх дысцыплінах выканан поўнасцю.

Сярэдняя паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання склала 93,8 працэнта, што на 0,7 працэнта вышэй вынікаў зімовай сесіі мінулага года; паспяховасць студэнтаў вячэрніх аддзяленняў — 87,3 працэнта, што на 4,1 працэнта вышэй, чым у мінулагоднюю сесію.

Найбольш высокія вынікі маюць гістарычны факультэт (96,7) і факультэт журналістыкі (96,8); па вячэрніх аддзяленнях: гістарычны (94,1), хімічны (90,8).

Павялічылася колькасць студэнтаў дзённай формы навучання, атрымаўшых выдатныя адзнакі, з 13,9 працэнта да 14,4 працэнта, выдатныя і добрыя адзнакі — з 45,6 да 46,7 працэнта.

На 37 чалавек зменшылася колькасць студэнтаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Факультэты прыкладной матэматыкі, фізічны і матэматычны (дзённая форма навучання) па выніках абсалютнай паспяховасці, як і ў мінулым навучальным годзе, занялі апошнія месцы сярод факультэтаў універсітэта.

На вячэрніх аддзяленнях найбольш нізкія паказчыкі маюць факультэты: матэматычны (85,8), філалагічны (83,7), фізічны (80,2).

Адзначаецца нераўнамернасць паспяховасці і па курсах. Найбольш высокая на пятых (98,5), найбольш нізкая на першых (89,0) і на трэціх (92,4) усіх факультэтаў, акрамя філалагічнага. Тут становішча іншае. Калі першы курс мае 12, другі і трэці толькі па дзве, то чацвёрты курс — 55 нездавальняючых адзнак.

Яшчэ больш нізкая паспяховасць на вячэрнім аддзяленні гэтага курса. Яна склала усяго толькі 51 працэнт.

Такім чынам, вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі сведчаць аб тым, што не на ўсіх факультэтах і кафедрах поўнасцю выкарыстоўваюцца магчымасці для павышэння ўзроўню вучэбна - метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы.

Калектывы кафедр і факультэтаў усё яшчэ недастаткова працуюць са студэнтамі першых курсаў. Паспяховасць на гэтых курсах вельмі нізкая, яна складае 89 працэнтаў, што на 4,8 працэнта ніжэй сярэдняй акадэмічнай паспяховасці ў цэлым па універсітэту. На гэтых факультэтах не наладжана сістэма ўліку бягучай паспяховасці студэнтаў, недастаткова праводзіцца індывідуальная работа са студэнтамі малодшых курсаў куратарамі вучэбных груп. Асобныя з іх не толькі не сачылі за паспяховасцю студэнтаў на працягу семестра, але і не цікавіліся, як яны здаюць залікі і экзамены (фізфак, філфак, матфак і іншыя).

Прамы ўплыў на паспяховасць аказвае і вучэбная дысцыпліна на факультэтах. Стан дысцыпліны характарызуюць і даныя аб колькасці студэнтаў, якія былі выключаны з універсітэта па такіх прычынах, як пропуск заняткаў, непаспяховасць, п'янкі і амаральныя паводзіны. Так, у I семестры па гэтых прычынах было выключана 65 студэнтаў. Найбольшая колькасць выключэнняў на фізічным і матэматычным факультэтах.

На працягу прайшоўшага семестра былі спазненні і адсутнасць на занятках без уважлівых прычын студэнтаў філалагічнага, хімічнага, гістарычнага, біялагічнага і іншых факультэтаў.

Не ў поўнай меры адпавядае сучасным запатрабаванням якасць асобных лекцый, практычных і семінарскіх заняткаў. Не на ўсіх кафедрах наладжаны наведванне і ўзаеманаведванне лекцый і разбор іх на пасяджэннях кафедр і метадычных камісіях факультэтаў. Не вядуцца журналы наведвання і ўзаеманаведвання лекцый.

Усе гэтыя факты паказваюць, што нашаму калектыву патрэбна яшчэ многа папрацаваць. Асноўныя намаганні калектываў факультэтаў і кафедр неабходна сканцэнтраваць на далейшым удасканаленні навуковай арганізацыі навучальнага працэсу, усямерным павышэнні ідэйна - тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню навучання.

Мы маем усе магчымасці для паспяховага рашэння задач па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй.

**В. ДАЛГАРУКАЎ,**
**начальнік вучэбнага аддзела.**

## ЭСТАФЕТА ПАКАЛЕННЯЎ





Пад урачыстыя гукі маршаў на сцэну уносяцца сцягі праслаўленых часцей Савецкай Арміі, авеяных славай гераічных баёў, якія цяпер захоўваюцца ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На экране адзін за другім змяняюцца дакументальныя кадры, якія расказваюць аб гераічным шляху Узброеных Сіл нашай краіны.

На сцэну паднімаецца госць калектыву БДУ — удзельнік грамадзянскай вайны П. Б. Аляксееў. З вялікай увагай слухалі прысутныя яго хвалюючы расказ аб незабыўных днях.

Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны П. М. Казарцаў і І. В. Марчанка павялі размову аб гераічным подзвігу нашых салдат у гады другой сусветнай вайны.

Эстафету героікі працягваюць маладыя воіны-гвардзейцы Рагачоўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі імя Вярхоўнага Савета БССР, якія прыехалі ў госці да студэнтаў.

На вечары ветэранам вайны былі уручаны кветкі і падарункі.

Ва урачыстасцях, прысвечаных 57-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, прыняў удзел ансамбль песні і танца Дагестанскага дзяржаўнага універсітэта.



**Наш кар.**

**Фота Д. ПРЭСА.**

## КАМСАМОЛЬСКАЯ ПАВЕРКА

Гонар першым сярод ВНУ рэспублікі пачаць абмен камсамольскіх дакументаў выпаў нашаму універсітэту.

Абмен павінен стаць свайго роду аглядам сіл, праверкай таго, як кожная камсамольская арганізацыя выконвае рашэнні партыі.

Ва універсітэце абмен камсамольскіх дакументаў пачнецца 1 сакавіка. У гэты дзень новыя членскія білеты саюза моладзі з сілуэтам Ільіча на чырвонай вокладцы будуць уручаны усім ленінскім стыпендыятам БДУ. Акрамя іх, права першымі атрымаць новыя білеты заслужылі байцы зімовага студэнцкага будаўнічага атрада імя 30-годдзя Перамогі.

3 сакавіка новыя білеты будуць уручаны усім камсамольцам аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта, адной з лепшых камсамольскіх арганізацый універсітэта.

Затым, па графіку, білеты будуць абменьвацца камсамольцам-пяцікурснікам усіх факультэтаў. Выключэнне зроблена толькі для камсамольскай арганізацыі IV курса філфака, таксама адной з лепшых у БДУ. Студэнты малодшых курсаў будуць абменьваць камсамольскія дакументы пасля канікулаў.

Падрыхтоўка да абмену ў поўным разгары. На факультэтах складзены спісы камсамольцаў па курсах, праходзяць камсамольскія сходы, прысвечаныя абмену.

**Наш. кар.**

## КУРАТАРСКІ САВЕТ

Адбыўся агульнауніверсітэцкі семінар куратараў акадэмічных груп, які правялі рэктарат і партком універсітэта.

На семінары быў абмеркаван удзел куратараў груп у падрыхтоўцы і правядзенні абмену камсамольскіх дакументаў.

Адкрыў семінар член парткома С. А. Малевіч. Сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч, які выступіў перад куратарамі, звярнуў увагу на задачу кожнай акадэмічнай групы — прыйсці да адказнай падзеі ў жыцці камсамола згуртаваным, баявым калектывам. І тут роля куратара як старэйшага таварыша, вопытнага настаўніка студэнцтва вельмі вялікая, асабліва ў падрыхтоўчы перыяд.

У гэтыя дні студэнты і іх старэйшыя таварышы рыхтуюцца да Ленінскіх урокаў «Твой камсамольскі білет», арганізуюць у групах выступленні ветэранаў партыі, камсамола, робяць выстаўкі.

# ДАЙ РУКУ, РАВЕСНІК!

Аднойчы, у канцы кастрычніка, да нас у аўдыторыю прыйшлі дзве дзяўчыны і сказалі: «Рабяты, трэба стварыць на гістфаку інтэрклуб. Хто «за»?».

На першым пасяджэнні нас было 16 чалавек, у асноўным самыя цікаўныя і непаседлівыя — першакурснікі і студэнты II курса. Між сабой амаль не былі знаёмы. Сабраліся на кафедры гісторыі КПСС. Усё было цікава і крыху загадкава. Спачатку сядзелі ціха і ўважліва слухалі Галю Петрыкаву, адказную за інтэрработу ў камітэце камсамола гістфака.

А потым пачалося! Прыдумвалі назву клубу, дэвіз, назвы сектараў. Кожны прапаноўваў сваё, нешта даказваў і гарачыўся.

Разышліся позна. Рашылі збірацца кожны чацвер. На першым пасяджэнні выбралі прэзідэнта клуба — Галю Петрыкаву, віцэ-прэзідэнта — Насцю Масейка. Стварылі прэс-цэнтр і сектары: культмасавы, па перапісцы з сацыялістычнымі краінамі, унутраных сувязей, шэфскі. На гэтым жа пасяджэнні было вырашана ўзяць шэфства над падрыхтоўчым факультэтам па навучанню замежных студэнтаў. Гэта было пачаткам цікавай і складанай работы.

З таго часу ўсё і закруцілася. На перапынках збіраліся разам і дзяліліся навінамі. Наш клуб адразу ж стаў прыкметным на факультэце. Намі цікавіліся, да нас прыходзілі. Было вырашана для ўсіх паступаючых устанавіць кандыдацкі тэрмін.

Кожнае наша пасяджэнне не падобна на ўсе астатнія. Часта слухаем цікавыя лекцыі выкладчыкаў, якія пабывалі за граніцай, сустракаемся з нашымі замежнымі сябрамі, абмяркоўваем бягучыя справы.

Але ўсю нашу работу немагчыма заключыць у рамкі адных пасяджэнняў. Мы часта сустракаемся са сваімі равеснікамі з іншых краін, разам рыхтуем вечары дружбы, суправаджаем нашых сяброў на экскурсіі ў школы, на прадпрыемствы, дапамагаем вывучаць рускую мову. Работы вельмі многа і працаваць цікава.

Асабліва нам запомніўся навагодні вечар. Колькі было клопатаў, надзей! Кожны дапамагаў, чым мог. Пачалі рыхтавацца да вечара за месяц да свята: даставалі маскарадныя касцюмы, рэпеціравалі. І вечар удаўся.

Планаў на будучае многа. Гэта і паездка ў Брэсцкую крэпасць, і вечары, і выезды з агітбрыгадай, экскурсіі.

З упэўненасцю можна сказаць: кожны новы дзень будзе напоўнен цікавай і змястоўнай работай.

**Л. КАРАЧУН,**
**гістфак, II курс.**

СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

# АБМЕРКАВАЛІ ПА-ДЗЕЛАВОМУ

У інтэрнаце № 3 адбыўся сход з удзелам супрацоўнікаў адміністрацыйна - гаспадарчай часткі універсітэта, прадстаўнікоў дэканата і прафесарска - выкладчыцкага саставу факультэта журналістыкі.

Паводзіны студэнтаў у інтэрнаце, упарадкаванне быту жыхароў — гэтыя пытанні былі дэталёва разгледжаны ў выступленнях дэкана факультэта Р. В. Булацкага, намесніка дэкана А. І. Раковіча, выкладчыка, адказнага за інтэрнат А. Г. Слукі, членаў студсавета і многіх іншых. Ускрыты недахопы, якія з'явіліся вынікамі дрэннай работы членаў прафбюро, абыякавых адносін да спраў інтэрната партгрупы, якую узначальвае А. Кірыловіч, і асобных членаў студсавета.

Сур'ёзная размова зайшла і пра дысцыпліну, стаўленне студэнтаў да грамадскай маёмасці. Сход выказаў думку, што такім жыхарам, як М. Дэгіс, В. Старасціна, У. Дашкевіч, якія сістэматычна парушаюць правілы паводзін, не месца ў інтэрнаце.

Але ў параўнанні з мінулым годам адбыліся і станоўчыя змены — рэгулярна выпускаецца насценгазета «Журналіст», працуе фоталабараторыя, арганізаван камсамольскі патруль пад кіраўніцтвам Л. Левіта, палепшыліся і бытавыя умовы.

Думаецца, што пасля сходу справы ў інтэрнаце пойдуць лепш.

**Т. ШАФАРЭВІЧ,**
**старшыня студсавета інтэрната № 3.**

НА ФІЗФАКУ

# САПРАЎДНАЯ РАБОТА, САПРАЎДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

У АПОШНІ час аб студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях у нас ва універсітэце гавораць многа. Не таму, вядома, што мець СНДЛ пры кафедры сёння лічыцца модным, а таму, што справа гэта важная і патрэбная.

Упершыню студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя была створана пры фізічным факультэце ў 1964 годзе. Першапачатковыя работы яе калектыву з вышыні сённяшніх спраў здаюцца нязначнымі, радыёаматарскага узроўню. Не быў выбран пэўны кірунак навуковых работ — не проста цікавы, але і матэрыяльна карысны. Не было тады ў лабараторыі і неабходнай матэрыяльнай базы. А галоўнае, як факультэцкая, СНДЛ не мела канкрэтнага кіраўніка.

У 1967 годзе над лабараторыяй узяла шэфства кафедра радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. Гэта добра адбілася на далейшым лёсе СНДЛ. Яна была аснашчана неабходнымі для правядзення навуковых даследаванняў прыборамі, забяспечана матэрыяламі і абсталяваннем. З ліку студэнтаў IV—V курсаў, прымаўшых удзел у навуковай рабоце кафедры, быў сфарміраван састаў лабараторыі.

Кірунак работ кафедры радыёфізікі акрэсліў усю тэматыку студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі. Гэта работы па даследаванню і распрацоўцы вузлоў лічбавай і аналагавай апаратуры для выдзялення, рэгістрацыі і апрацоўкі карыснай інфармацыі, якая прымаецца ў прысутнасці перашкод; удасканаленне некаторых элементаў і вузлоў вылічальнай тэхнікі; даследаванне метадаў і распрацоўка апаратуры для зняцця акустычных галаграм.

На першы погляд усё было ў лабараторыі добра. Група супрацоўнікаў кафедры давала пэўны аб'ём работы, якую выконвалі студэнты. Але ўсё ж лабараторыя не мела свайго твару. Такая аднačасовая шматтэмнасць рабіла яе, хоць і ў навукова-даследчым плане, але усё ж дапаможнай. Нарэшце, з 1971 года ў лабараторыі пачынае акрэслівацца самастойная тэма. К гэтаму часу на кафедры і ў лабараторыі быў накоплен пэўны вопыт у галіне выдзялення і апрацоўкі сігналаў з шумаў. Гэта і выкарысталі.

Падкрэслім зыходны момант у дзейнасці СНДЛ. Тэматыка даследчай работы і ўся практычная дзейнасць студэнтаў, занятых у лабараторыі, плануецца так, каб вынікі знайшлі сваё прымяненне ці то ў правядзенні комплексу даследчых работ, ці то недзе непасрэдна на вытворчасці. Такім чынам, асноўная форма работы — гаспадарча-дагаворная. Гэта дае магчымасць не толькі матэрыяльна зацікавіць найбольш падрыхтаваных студэнтаў (зарплата ад 35 да 90 рублёў), але і, маючы пэўныя сродкі, самастойна купляць неабходныя матэрыялы і абсталяванне.

Вынікі работы СНДЛ гавораць самі за сябе. Толькі за два апошнія гады выканана гаспадарча-дагаворных работ для прадпрыемстваў Масквы і Ленінграда на суму 140 тысяч рублёў. Распрацаваны ў лабараторыі дыягнастычны аналізатар вібраакустычных шумаў АНД-І атрымаў высокую ацэнку на канферэнцыі па метадах тэхнічнай дыягностыкі авіярухавікоў, што адбылася ў Маскве. І ўсе гэтыя работы як тэарэтычна, так і практычна выкананы студэнтамі. Напрыклад, сёння ў лабараторыі працуюць пяцікурснікі Валерый Шнітко, Генадзь Астапенка, Мікалай Скрыган, пра якіх можна сказаць, што працуюць яны даўно на узроўні кваліфікаваных спецыялістаў-радыёфізікаў. На чацвёртым курсе рабяты самастойна рашаюць складаныя задачы на узроўні дыпломных распрацовак.

Па выніках сваіх даследаванняў, праведзеных у лабараторыі, студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя работы, выступаюць на семінарах, якія рэгулярна праводзяцца ў лабараторыі, робяць даклады на канферэнцыях, з'яўляюцца сааўтарамі работ, апублікаваных у рэспубліканскім і саюзным друку.

Вядома, СНДЛ зацікаўлена ў добрым папаўненні і запрашае ў свой калектыў тых, хто па-сапраўднаму любіць працу даследчыка, не ўцячэ ад складанай задачы, словам, — маладых, таленавітых, працавітых.

**А. БЕЛЫ,**
**малодшы навуковы супрацоўнік.**





# ШЧОДРАСЦЬ СЯБРОЎСТВА

— Паважаныя сябры, вас віншуюць госці з Дагестана! — словы Рамана Чорнага, які вядзе канцэрт, патанулі ў бурных, гарачых апладысментах. Зала вітала ансамбль песні і танца Дагестанскага дзяржаўнага універсітэта.

Дэлегацыя з ДДУ на чале з прарэктарам па навуковай рабоце П. І. Таланаыным была запрошана прафкомам нашага універсітэта ў сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 30-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй.

50 чалавек нашых гасцей — людзі пятнаццаці нацыянальнасцей — у асноўным удзельнікі ансамбля песні і танца. А ўсяго ў ансамблі, якім кіруе ужо 24 гады народны артыст Дагестанскай АССР, лаўрэат міжнародных конкурсаў Казім Абасавіч Манафаў, танцуюць і спяваюць 250 чалавек.

Ні адзін гарадскі ці рэспубліканскі конкурс не праходзіць без яго удзелу. А ў 1969 годзе на міжнародным конкурсе ў польскім горадзе Закапане ён заваяваў галоўны прыз «Залатая сякерка». У 1971 годзе іскрыстаму, задорнаму майстэрству спевакоў і танцораў дарылі апладысменты пятнаццаць гарадоў Еўропы.

Рэпертуар ансамбля складаюць у асноўным танцы народаў Дагестана — «Кумыкскі дзявочы», аварскі «Кахіта», лакскі народны танец «Кісу» і іншыя.

У Мінску ансамбль упершыню. Нашы госці наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, домік І з'езда РСДРП, пабывалі ў Хатыні, пазнаёміліся з жыццём студэнтаў нашага універсітэта, выступілі з канцэртам у політэхнічным інстытуце і ў Сувораўскім вучылішчы.

— Мінск зрабіў на нас вялікае ўражанне, цудоўны горад, — у адзін голас гавораць студэнты ДДУ, а Арслан Чабакаеў, студэнт трэцяга курса юрыдычнага факультэта, дадае:

— У Мінску цікавая архітэктура, тут своеасаблівыя людзі — душэўныя, простыя, рады гасцям. І, аглядаючы ваш горад, немагчыма ўявіць, што на месцы яго былі руіны.

У час святкавання 57-й гадавіны Узброеных Сіл СССР гасцям былі ўручаны Ганаровая грамата і сувенір «Белавежскі зубр». У сваю чаргу прадстаўнікі ДДУ падарылі нашаму універсітэту партрэт У. І. Леніна, зроблены майстрамі ДДУ, сувенір «Гаранка» і сваё яскравае, радаснае майстэрства.

...Хвалюючая кампазіцыя, прысвечаная 30-годдзю Перамогі, змяняецца іскрыстым танцам джыгітаў і стройных дзяўчат. Здаецца, сцэна нашай актавай залы раздалася, і сюды ўварвалася дагестанскае сонца.

«Бакъан». Гэта аварскае слова мае два значэнні: мелодыя і самаадчуванне чалавека. «Бакъан» — лірычная песня пра каханне маладога джыгіта да маладой гаранкі ў выкананні студэнта IV курса гістарычнага факультэта Гульмета Ахмедава змяняецца песняй «Аталар» («Бацька»), выканаўцам якой быў Абдулнасыр Кірэеў.

Пасля канцэрта мы сустрэліся з удзельнікамі ансамбля і яго кіраўніком.

— Вельмі прыемна, — гаворыць Казім Абасавіч, — працаваць з нашымі рабятамі. Заўсёды атрымліваеш задавальненне, калі бачыш вынікі сваёй працы. З нейкім жалем развітваешся з удзельнікамі ансамбля на пятым курсе, але кожны год да нас прыходзяць новыя людзі, і хоць у нейкай меры даводзіцца пачынаць спачатку, мы выступаем далей удала.

Салмаз Ібрагімава, студэнтка III курса біялагічнага факультэта, атрымлівае стыпендыю імя Сярго Арджанікідзе.

— Танцую ў ансамблі тры гады і не магу уявіць сябе без яго. Кожны раз з нецярпеннем чакаю рэпетыцыі. Мне і ўсім маім сябрам вельмі прыемна, што нас прымаюць так цёпла і сардэчна.

Сувязі паміж нашымі універсітэтамі умацоўваюцца. Пяць год назад дэлегацыя БДУ гасціла ў Дагестане, і вось зноў доўгачаканая сустрэча, на гэты раз у Мінску. Глыбока сімвалічна, што і ў Махачкале, і ў Мінску універсітэты носяць імя вялікага правадыра — Уладзіміра Ільіча Леніна, які пакінуў запавет моладзі — высока несці сцяг сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

Сёння Дагестан, як і Беларусь, тысячамі ніцей звязаны з усімі народамі і самымі далёкімі куткамі савецкай многанацыянальнай дзяржавы.

**Т. МАЛМЫГА,**
**В. ЮСЬКА.**
**(Карпункт прафкома).**

**На здымках:** цёпла сустракаюць выступленні танцораў ансамбля ДДУ беларускія сябры.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# ПА ВЯПСОЎСКІХ ЛЯСАХ

Свабодны час праводзяць па-рознаму. Для турыстау зімовыя канікулы — пара лыжных паходау. Невядомая, неразгаданая сіла цягне на Карпацкія схілы, за Палярны круг, у лясы Урала, на узгоркі Валдая. Усё больш скупая на снягі Беларусь таксама вабіць загадкавай першай парошай.

З мноства турысцкіх груп універсітэта тры пракладвалі лыжню па Вяпсоускім узвышшы — глухім лясным краі на пауночным усходзе Ленінградскай вобласці.

Сёння гутарку у газеце вядуць кіраунікі гэтых паходау, члены клуба турыстау-альпіністау БДУ, студэнты фізічнага факультэта Уладзімір Александроускі, Георгій Стэльмах і Мікалай Шарашавец.

**Александроускі, старшыня КТА:** Па-першае, чаму мы выбралі гэты раён падарожжа. Па Вяпсоускім узвышшы яшчэ не хадзілі нашы турысты. Мы ведалі аб гэтым узгоркавым, лясным і азёрным краі толькі з літаратурных апісанняу. А нязведанае заусёды прыцягвае. Яшчэ восенню мы намецілі гэты раён, блізкі да Карэліі і Валагодчыны, — месцау, якія папулярны сярод турыстау.

**Стэльмах:** Нашы маршруты праходзілі там, дзе былі спынены фашысцкія войскі, дзе пралягала вядомая «дарога жыцця» у асаджаны Ленінград. Турысты універсітэта не забываюць месц, што асвячоны дыханнем гераічнага мінулага. І на гэты раз нам хацелася прадоужыць традыцыю.

**Шарашавец:** Акрамя гэтага, было намечана злучыць маршруты груп у адным пункце і правесці на месцы сустрэчы традыцыйны зімовы злет турыстау БДУ.

**Александроускі:** Чаго нас пацягнула у гэтыя месцы? Гэтае пытанне — частка агульнага пытання: навошта наогул ходзяць у паходы? Зімой і летам, пад дажджом і у спякоту. Чаму самадзейны турызм расце у шырыню і у глыбіню? Вядома, карысць турызму відавочная і несумненная: выхаванне патрыятызму, калектывізму, любві да прыроды, спартыунае удасканаленне, набыццё лепшых якасцей сяброуства. Гэта і спорт (кожны год у клубе паяуляюцца дзесяткі новых разраднікау), і не толькі спорт. Гэта уклад у справу выхавання новага чалавека. А дапамога клубу турыстау-альпіністау БДУ пакуль, мякка кажучы, слабая.

**Стэльмах:** Рух расце дзякуючы невычэрпнаму энтузіязму. Ты, Валодзя, правільна гаворыш, але мы адхіліліся. Тэма, закранутая табой, патрабуе асобнай сур'ёзнай гутаркі. Давай вернемся да нашых паходау. Чаго мы ад іх чакалі і што атрымалі?

**Александроускі:** Заусёды, калі ідзеш у новы паход, чакаеш чагосьці асаблівага, што робіць яго не падобным на іншыя. Гэта і своеасаблівая прырода, і цікавыя сустрэчы...

**Шарашавец:** Вопыт, які накопліваецца з кожным паходам...

**Александроускі:** А галоунае — новыя сябры.

**Шарашавец:** І снегу, асабліва у гэтым годзе нам хацелася сапрауднага, вялікага снегу. Лыжы нашы павісквалі ад захаплення, калі, нарэшце, сустрэлі яго у ленінградскіх лясах.

**Стэльмах:** Так... Снег іскрыцца пад сонцам, снег шапкамі, кажухамі ляжыць на ялінах і соснах, карункамі прыбірае бярозы, снег кружыцца усюды, засыпаючы рукзакі і штармоукі. Касцёр на снезе, чай з расплауленага снегу і песня пад гітару...

Снег, снег, снег, снег,
Снег над палаткой кружится...

**Шарашавец:** А азёры? Такія разнастайныя і прыгожыя. Некранутая бель паверхні, акружаная глухім лесам...

**Стэльмах:** Дарэчы, ісці па гэтай некранутай белі нялёгка. Паміж снегам і льдом аказваецца слой вады, і лыжы набываюць вельмі модную ледзяную «платформу», што зусім не спрыяе слізганню.

**Александроускі:** Затое даужэй будзем памятаць і гэтыя азёры, што паяуляюцца з-за узгоркау, і лес у снезе, і пауночныя вёскі...

**Шарашавец:** І злёт наш на возеры Лэрынскім, і песні у мароз ля кастра...

**Александроускі:** Усё гэта гаворыць аб тым, што мы не памыліліся, праклаушы свае маршруты тут. А ярка-аранжавае сонца, што заглядае у вокны вагона, які адвозіць нас да вялікіх гарадоу, будзе свяціць доуга, запрашаючы нас вярнуцца...

А усё-такі самае галоунае у паходах — гэта вяртанне да сяброу. Расказаць, захапіць іх тым, што убачыу, паслухаць іх расказы, загарэцца новымі планамі, марамі...

**Стэльмах:** Магчыма, але для гэтага трэба успацець на лыжні, «пастукаць зубамі» на прывале... І застыць, зачараваным якой-небудзь лясной казкай.

**Александроускі:** Безумоуна, таму і чакаеш новай зімы.

**Шарашавец:** Вясны! Вясновых паходау. Соснау і дубоу, падснежнікау пад нагамі, мінулагодніх журавін на палескіх балотах...

**Стэльмах:** Праплыць на байдарцы сярод лілей... Але аб гэтым пазней.

Фота **У. Александроускага.**



# СТАРТЫ ДРУГОГА СЕМЕСТРА

З пачаткам заняткау у другім семестры значна ажывілася спартыуна-масавая работа. І гэта не выпадкова, бо у гэтым годзе нашым спартсменам трэба будзе вытрымаць сур'ёзны экзамен у прадстаячых стартах VIII зімовай спартакіяды прафсаюзау, XVIII летняй спартакіяды ВНУ рэспублікі і VI летняй спартакіяды народау СССР.

І студэнты не трацяць дарэмна часу. Першымі на старты выйшлі лыжнікі хімічнага, біялагічнага, фізічнага, матэматычнага і філалагічнага факультэтау. У спаборніцтвах прыняло удзел звыш 1000 чалавек. Каля 700 студэнтау выканалі нарматывы комплексу ГПА, 261 — разрадныя нарматывы. У бліжэйшыя дні правядуць свае спаборніцтвы студэнты іншых факультэтау.

Выдатных вынікау дабілася студэнтка II курса геафака Яугенія Рашкевіч, якая, выступаючы на асабістым першынстве БССР, упершыню выканала нарматывы майстра спорту СССР па лыжах.

17—18 лютага праходзілі спаборніцтвы паміж факультэтамі па цяжкай атлетыцы. У іх прынялі удзел студэнты сямі факультэтау.

З вялікай перавагай перамаглі цяжкаатлеты фізічнага факультэта, набраушы 197 ачкоу. На другім месцы юрысты — 118 ачкоу, на трэцім гісторыкі — 90 ачкоу.

Паспяхова выступілі на гэтых спаборніцтвах студэнты III курса фізічнага факультэта Мікалай Бутавец і Алег Гусеу, якія выканалі нарматыу кандыдата у майстры спорту. Добрых вынікау дабіліся гэтыя студэнты, выступаючы 21—24 лютага на юнацкім першынстве ЦС СДСТ «Буравеснік» у г. Куйбышаве. Яны абодва сталі чэмпіёнамі Цэнтральнага Савета, паказаушы высокія вынікі, а Мікалай Бутавец упершыню выканау нарматыу майстра спорту па цяжкай атлетыцы. Гэта прыемныя вынікі, а ёсць яшчэ адзін.

Гэтыя спаборніцтвы паказалі, што у нас няма добрых спартсменау у легкіх, паулёгкіх і другой цяжкой вагавых катэгорыях. Выкладчыкам неабходна больш удзяліць увагі у сваёй рабоце са спартсменамі у гэтых катэгорыях.

18 лютага пачаліся спаборніцтвы па ручному мячу. Ужо гульні першага тура у падгрупах паказалі, што лепш за іншых падрыхтаваліся жаночыя і мужчынскія каманды фізфака, матфака, ФПМ.

Зусім дрэнна аднесліся да пачатку гэтых спаборніцтвау студэнты біялагічнага факультэта: На першую гульню з матэматычным факультэтам з'явілася усяго 3 чалавекі замест 7. Нез'яуленні студэнтау гэтага факультэта на спаборніцтвы па іншых відах, напрыклад, па вольнай і класічнай барацьбе, мелі месца і у першым семестры. Мужчынская каманда па валейболу з-за гэтага была наогул знята са спаборніцтвау. Дэканат і камсамольская арганізацыя факультэта не рэагавалі на такія неспартыуныя паводзіны студэнтау.

Спаборніцтвы па ручному мячу прадоужацца да 15 сакавіка, і неабходна за час, што застауся, выправіць біёлагам сваё становішча.

У поуным разгары спаборніцтвы па шахматах. У іх удзельнічаюць каманды 10 факультэтау. Пасля трох турау лідзіруюць студэнты ФПМ — 16,5 ачка з 21, матэматыкі — 15, хімікі — 13 ачкоу.

Падвялі вынікі першых двух тыдняу спаборніцтвау лыжнікі, якія 24—25 лютага прымалі удзел у першынстве універсітэта у раёне станцыі Зялёнае. На працягу двух дзён ішла упартая барацьба за прызавыя месцы у спартакіядзе. Удзельнікамі спаборніцтва было больш за 200 студэнтау БДУ. Камандную перамогу здабылі хімікі.

У сакавіку пройдуць спаборніцтвы па барацьбе самба, лёгкай атлетыцы, шашках, зімоваму мнагабор'ю ГПА, настольнаму тэнісу.

**В. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**старшыня спортклуба БДУ.**

ПІСЬМЫ У РЭДАКЦЫЮ

# І ТОЛЬКІ «СНЕГАБОЛ»?

Тое, што фізічная культура і спорт дауно ужо сталі нашымі нязменнымі спадарожнікамі у жыцці, ведаюць усе. І тое, што яны садзейнічаюць умацаванню здароуя, таксама вядома кожнаму. І у нас ва універсітэце колькі майстроу спорту! А кандыдатау, першаразраднікау! І ці не нашы спартсмены займаюць першыя месцы у шматлікіх спаборніцтвах!

Усё гэта так. І мы ганарымся дасягненнямі універсітэцкіх спартсменау. Але ж разраднікі і рэкардсмены павышаюць сваё майстэрства у секцыях. Значная ж, калі не большая частка студэнтау, займаецца у агульных групах фізічнага выхавання.

Вось на гэтым выхаванні у гэтых самых групах і хацелася б спыніцца.

Перш за усё — дзе праходзяць заняткі? У любы час — ці то дождж, ці то снег, ці то вецер — праходзяць яны заужды на універсітэцкім стадыёне. Вядома, свежае паветра і загартоука арганізма — вялікая справа. Але ж пасля тых заняткау прыходзіцца шкарпэткі выкручваць, бо на стадыёне шмат вады. Такія рэгулярныя «ванны» наурад ці садзейнічаюць умацаванню здароуя.

Чаму такое становішча? Як растлумачыу нам выкладчык фізвыхавання У. І. Яжоу, у спортзалах праходзяць заняткі секцый. А для усіх астатніх — стадыён.

Ну, добра, няхай сабе і стадыён. Але што на ім ёсць, акрамя снегу і вады? Ёсць футбольнае поле. «Але ж не па снезе у футбол гуляюць», — скажаце вы. Гуляюць. Бо каб заняцца чым іншым, патрэбны умовы, а іх якраз і няма. Ды і гульню тую футболам не назавеш. Так, смех адзін, беганя нейкая. Нават мяча добрага і таго няма. Неяк мы пацікавіліся у выкладчыка, чаму такое становішча. Дык ён не то жартам, не то сур'ёзна сказау: «Скіньцеся па рублю—не то што мяч, дзесяць купіце».

Дык няужо і спортінвентар — таксама увесь секцыям?

Дзіуна і тое, што на стадыёне, куды кожны дзень прыходзяць сотні студэнтау, няма самага звычайнага — туалета. Ды і раздзявальні пакідаюць жадаць лепшага.

Хочацца спадзявацца, што становішча, нарэшце, будзе выпраулена.

**А. ПРАНІШНІКАЎ,**
**О. НІКАЛАЙЧАНКА,**
**У. ЛІСОЎСКІ,**
**студэнты журфака.**

# ПЕРАМАГЛІ!

**У канцы мінулага тыдня ў спартыунай зале МПІ праходзілі спаборніцтвы на першынство Мінаблсавета СДСТ «Буравеснік» па мастацкай гімнастыцы. У спаборніцтвах паспяхова выступіла каманда нашага універсітэта, якая заняла першае месца. На другім і трэцім месцах—каманды МПІ і БПІ.**

**У асабістым заліну перамагла студэнтка юрфака БДУ Ларыса Вараб'ёва. Прызёрамі спаборніцтвау сталі Л. Аўчыннікава (МПІ) і І. Верамейчык (БПІ).**

**П. ГЕРАСІМОВІЧ.**







**БОКС! БОКС... БОКС!** Здымкі зроблены **В. ДРАЧОВЫМ** у час Мінскага міжнароднага турніра.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Крас ного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 05105 Заказ. № 363.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.